ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.45 (3405) ● ЧАЦВЕР, 27 ЛІСТАПАДА, 2014

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Час шчырай удзячнасці
Шэраг прадстаўніц беларускіх дыяспар ушанаваны за актыўную грамадскую дзейнасць
Стар. 2

На Залатой Горцы
У мінскага касцёла ў імя Найсвяцейшай Тройцы і святога Роха багатая гісторыя
Стар. 3

Падарылі госці казкі
У Рыгу завіталі з Мінска казачніца Алена Масла і паэт Сяргей Панізьнік
Стар. 4

РАЗАМ

Зямля далёкая і блізкая

Дні Беларусі ў Сібіры прайшлі змястоўна і цікава, з удзелам творчых гуртоў суродзічаў з розных гарадоў

У Новасібірску выступае народны ансамбль песні і танца “Спатканне” з Беларусі

Беларусь заўсёды была для Сібірскіх рэгіёнаў адным з важных партнёраў у галіне эканомікі, навукі, культуры. І нядаўнія Дні Беларусі ў Сібіры, безумоўна, паспрыяюць умацаванню і развіццю сувязяў.

Газета “Голас Радзімы” паведамляла: у міжнародным комплексе “Новосибирский Экспоцентр” працавала вялікая нацыянальная выстава беларускай тэхнікі і прамысловых тавараў. У Новасібірск прыязджаў Першы намеснік Прэм’ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка, прадстаўнікі Урада Беларусі, дзелавых колаў нашых краін. На форуме дзелавога супрацоўніцтва “Беларусь-Сібір” абмеркаваны перспектывы развіцця прамысловай кааперацыі, узаемадзеяння ў сферы сельскай гаспадаркі. Гаварылі і пра тое, як наладжваць узаемавыгадныя сувязі Беларусі з рэгіёнамі Сібірскай федэральнай акругі. У Доме навукоўцаў Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук прайшла навукова-практычная канферэнцыя па інавацыйным супрацоўніцтве. Пад час Дзён падпісаны шэраг дагавораў, пагадненняў, кантрактаў.

Цяпер колькі лічбаў. Як адзначылі на сустрэчах з высокімі гасцямі губернатар Новасібірскай вобласці Уладзімір Гарадзецкі і мэр горада Анатоль Локаць, таваразварот з Беларуссю апошнім часам складае больш за 40 працэнтаў усяго экспарту, і беларускую прадукцыю цэняць за высокую якасць. Знакамітыя БелАЗы і МАЗы, уборачная ды іншая тэхніка вядомыя далёка за межамі Беларусі. Новасібірцы некалькі гадоў камфортна адчуваюць сябе ў беларускіх аўтобусах і тралейбусах. Апошнія пагадненні даюць магчымасць беларускаму боку, напрыклад, стварацъ пляцоўкі для адкрыцця зборачных вытворчасцяў, і гэта выгадна для ўсіх. Ёсць у планах і адкрыццё сэрвіснага тэхнапарку для абслугоўвання тэхнікі.

Цэлы тыдзень у цэнтры Новасібірска працавала і выстава-продаж харчовых тавараў ад беларускіх вытворцаў. Попыт у сібіракоў на іх немалы, наведвальнікаў было шмат.

Многім запомніцца і вялікі святочны канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі і Сібіры ў Дзяржаўнай канцэртнай зале імя Арнольда Каца, якая нядаўна адкрылася ў Новасібірску. Была на канцэрце і ўся беларуская дэлегацыя. Сібір прадстаўлялі прафесійныя калектывы і асобныя выканаўцы як Новасібірска, так і Кемераўскай, Омскай, Томскай абласцей, Алтайскага краю. Сімвалічна гучалі казачая песня “Матушка Россия” і “Беларусь” у выкананні ансамбля Новасібірскай дзяржфілармоніі “Маркелловы голоса”. ➔ Стар. 4

ВЕСТКІ

Антон Шкапераў зноў на арбіце

Іван Іванаў

Камандзір экіпажа экспедыцыі на Міжнароднай касмічнай станцыі — Герой Расіі з беларускімі родавымі каранямі

“На МКС прыбыў новы касмічны экіпаж” — такая навіна з’явілася на інтэрнэт-сайтах у панядзелак. Між тым у касманаўта Антона Шкаплерава — беларускія родавыя карані. Першы раз ён быў у космасе з 14 лістапада 2011 па 28 красавіка 2012 года. Пра тое газета “Голас Радзімы” пісала ў тэксце “З Быхаўшчыны — у космас” (25.04.2013). Намеснік старшыні севастопальскай суполкі “Беларусь” Людміла Малько летась наведвала бацькоў касманаўта, Мікалая Іванавіча і Тамару Віктараўну, у Балаклаве. Яны родам з Магілёўскай вобласці: маці, 1950 года нараджэння, — з Быхава, а бацька на два гады старэйшы, з вёскі Кіпячы. “Вёскі той, цяпер не існуе. Дзяцінства і юнацтва будучых бацькоў касманаўта прайшло ў Беларусі, дзе ў іх і цяпер шмат родзічаў. Потым Мікалай вучыўся ў Кургане, служыў на востраве Рускі, вучыўся ў Ленінградзе ў школе падводнага плавання — і прыехаў у 1971-м, ужо жанаты, праходзіць службу ў Крым, у Балаклаву. Там у маладой сям’і 20 лютага 1972 года нарадзіўся хлопчык Антошка”, — пісала наша газета.

Экіпаж карабля “Союз-ТМА 15 М” — а гэта Антон Шкапераў, амерыканец Тэры Вертс ды італьянка Саманта Крыстафарэці — правядзе на арбіце 169 дзён.

ЖЫВАЯ СПАДЧЫНА

Моцныя дубы Якуба Коласа

Іван Ждановіч

Музей Песняра хутка адзначыць 55-годдзе

“Дубы дзе дружнай чарадою/ Стаяць, як вежы, над вадою”… Простыя і ў той жа час напоўненыя вялікай жыццёвай сілаю коласаўскія радкі ведаюць многія. Сімвал беларускай моцы і нязломнасці над нястрымнай плынню вякоў… З паэмы “Новая зямля” словы далёка паляцелі ў свет на крылах тужліва-светлай мелодыі кампазітара Ігара Лучанка. Аднак ці бачылі вы іншыя дубы: пры мінскай сядзібе Песняра, непадалёк ад галоўнага будынка Нацыянальнай акадэміі навук? Нядаўна зноў любаваўся імі. З вакна кабінета дырэктаркі музея, коласавай зямлячкі Зінаіды Камароўскай. “І гэта частка экспазіцыі — жывая спадчына, пакінутая для нашчадкаў клопатамі гаспадара: дубы пасадзіў сам Якуб Колас, — гаварыла яна пры вакне Наталлі Прушынскай, дачцэ Андрэя Мрыя. — Можаце потым да іх падысці”.

Навуковец з Петразаводска Наталля Прушынская была ў Мінску на міжнароднай канферэнцыі. Прыехалі з дачкою Аннай. Назваў бы Ганнай — так звалі і Коласаву маці — а будзе нацяжкай: роднай мовы дзеда, аўтара знакамітага рамана “Запіскі Самсона Самасуя”, унучка не ведае. Раман чытала ў перакладзе на рускую. У сямейным архіве, казала, ёсць беларускі фільм-спектакль, зняты паводле рамана. І Наталля Андрэеўна збіраецца зрабіць для родных цітры: каб нашчадкам Андрэя Мрыя, ці Андрэя Шашалевіча, ураджэнца вёскі Доўгавічы Чэрыкаўскага павету (цяпер Мсціслаўскі раён), было зразумела, пра што ж пісаў іх знакаміты дзед і прадзед… Чым балела яго душа… Ён быў рэпрэсаваны і потым, ужо вельмі хворым, вызвалены з лагера, ехаў, па сутнасці, паміраць — а яго забілі па дарозе да родных. Потым пасмяротна рэабілітавалі…

Выстаяць, зберагчы найгалоўную спадчыну продкаў — мову — на зямлі, якую з усіх бакоў падмываюць іншыя магутныя моўныя плыні, беларусам ва ўсе вякі было няпроста. І якім жа цяжкім, калі ўдумацца, быў каток рэпрэсій 20-30-х, калі нават і ўнукі класіка літаратуры Андрэя Мрыя не ведаюць мову ягоных твораў! А яна ж блізкая да рускай. Ад гэткай развагі ные душа. Ды ўсё ж, калі шчыра, заўсёды найбольш баліць нам — сваё, калі раны — канкрэтна ў маім целе, душы. Ці ў маіх блізкіх… Цяжка ўявіць, колькі перажылі і Наталля Андрэеўна, і яе маці, жонка “ворага народа” Соф’я Андрэеўна. Дачка пісьменніка расказала: страх пасля 20-40-х у натуры маці быў такім, што, каб сказаць нешта дзецям пра бацьку, яна выводзіла іх з хаты і… шаптала. Бо, папярэджвала, і сцены могуць мець вушы… Дарэчы, у 90-х я размаўляў з адным старым вяскоўцам з Мікалаеўшчыны, родзічам Коласа. Ён згадваў: як быў у Мінску ў ягоным кабінеце, акадэмік Колас прыкладваў палец да вуснаў, паказваў вачыма на столь ды ціха прасіў: “Чаго лішняга не кажы”...

Магчыма, Якуб Колас здолеў выстаяць, выжыць, дзясяткамі губляючы сяброў-пісьменнікаў, перажыць пару рэпрэсіўнага лесапавалу, бо з дзяцінства вучыўся стойкасці і нязломнасці ў наднёманскіх дубоў. Яго любімае дрэва. Пра тое расказвала экскурсавод гасцям, што і цяпер жывуць недалёка ад Салаўкоў: ад Петразаводска туды возяць цеплаходамі па Анежскім возеры турыстаў. І Анна, дарэчы, у тым турбізнэсе... ➔ Стар. 3

ЛЮДЗІ СПРАВЫ

Час шчырай удзячнасці

Шэраг прадстаўніц беларускіх дыяспар ушанаваны за актыўную грамадскую дзейнасць

Іван Ждановіч

Людміла Дзёміна з сынам Сяргеем і яго сям'ёй святкуюць Дзень Перамогі ў Тальяці

Людміла Дзёміна: "Жанчына Аўтаграда 2014 года"

Уявіце сабе: на першай старонцы тальяцінскай гарадской газеты "Площадь свободы" за 14 лістапада — беларускія словы: "Таспадыня беларусачка". На яркай падкладцы, вялікім шрыфтам. Там жа і здымак вядомай нашым чытачам суайчынніцы ў прыгожым беларускім строі з сынам Сяргеем Шылкіным і, здаецца, унучкай. І яшчэ словы па-руску: "Людміла Дзёміна па праве ўдастоена звання "Жанчына Аўтаграда 2014 года".

Цёплы, насычаны фактамі тэкст журналісткі Ларысы Агішавай "Таспадыня беларусачка" далей — амаль на ўсю 13-ю паласу, ілюстраваны прыгожымі здымкамі беларусаў Тальяці. Мы даведваемся, што "кіраўніцу беларускай суполкі Тальяці Людмілу Дзёміну даўно ведаюць у горадзе як творчага чалавека і нястомнага грамадскага дзеяча". Яна ж стваральніца і кіраўніца гурта "Купалінка", член грамадскага савета пры гарадской думе. Расказваецца, што Дзёміна — удзельніца мноства гарадскіх і міжнародных сацыяльных праектаў, мае ганаровае званне "Таспадыня-беларусачка" ад Бацькаўшчыны, а сёлета ўшанавана ў Тальяці як "Жанчына Аўтаграда 2014 года". "Энергічная, прыветлівая жанчына піша вершы, сцэнары, артыкулы для газет, арганізуе шматлікія мерапрыемсты, прадумваючы пры тым усе дэталі", — і гэта пра нашу зямлячку з Бабруйска. Якая, прадаўжае журналістка, сваю любоў да беларускай зямлі і народнай творчасці перадае дзецям і ўнукам. Як вядома, сын спадарыні Людмілы Сяргей Шылкін — арганізатар дзіцячага ансамбля беларускай песні "Зорачкі", у якім, дарэчы, спяваюць 15-гадовы Віталь і 6-гадовая Марыя Шылкіны. Вось дзе моцны сплаў і роднага, і народнага!

Невялічкае адступленне. Неяк у рэдакцыю данесілася незадаволенае вуркатанне: маўляў, як ні разгорнеш газету — то ўсё Дзёміна ды Шылкін… А цяпер скажыце, шаноўныя актывісты з беларускіх суполак замежжа: хто з вас гэтаксама, як Дзёміна, сваіх дзяцей і ўнукаў далучыў да беларускіх справаў? Дарэчы, на пытанне тальяцінскай журналісткі, як у яе на ўсё хапае часу, Дзёміна адказвае: "Калі любіш справу, якой займаешся, то заўсёды знойдзеш час. Мой рабочы дзень пачынаецца ў 7 раніцы і заканчваецца за апоўнач. І так увесь рабочы тыдзень". Мы ж будзем і надалей падтрымліваць тых, хто гэтак самаддана ў замежжы працуе на карысць Бацькаўшчыны, на яе станоўчы імідж. Рэалізуйце цікавыя праекты, актыўней "будзіце" суродзічаў, якія забыліся пра свае карані, заваёўвайце ўзнагароды і ганаровыя званні — і слава вас таксама знойдзе!

Далучаемся да віншаванняў. Шчасця Вам і надзейных сяброў, Таспадыня-беларусачка і Жанчына Аўтаграда! І паменш зайздроснікаў...

Ніна Кабанава: падзяка ад Пасольства

Вялікую дзейнасць разгарнулі нашы суайчыннікі і ў Новасібірску. Там, як вядома, ёсць Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у імя святой Еўфрасінні Полацкай і Новасібірскі цэнтр беларускай культуры. Наколькі нам вядома, дзейнічаюць яны паралельна. Што ж, іх выбар: абы на карысць Айчыны. Пра справы абодвух цэнтраў шмат інфармацыі ў інтэрнэце. Заслугоўвае павагі і карпатлівая праца Людмілы Шчаслівенкі ды Аляксандра Лагуценкі, якія аператыўна, з добрым гумарам падаюць на сваім сайце фотасправаздачы з тэкстамі пра сустрэчы, фестывалі, ушанаванні суайчыннікаў, якія ладзяць у Святаеўфрасіннеўскім цэнтры. Цікава з новасібірскай глыбінкі пісала, пабываўшы там у суродзічаў-беларусаў, журналістка газеты "Звязда" Надзея Дрыла. Яна ж данесла чытачам хвалюючую гісторыю пра тое, як пры пасрэдніцтве Людмілы Шчаслівенкі ўнучка з Сібіры знайшла родзічаў у Пастаўскім раёне — праз амаль паўстагоддзя! Тэксты ёсць у інтэрнэце: шукайце, чытайце. Мы ж хочам тут павіншаваць руплівую дырэктарку Новасібірскага цэнтра беларускай культуры Ніну Кабанаву. Пра справы Ніны Васілеўны і яе аднадумцаў, у тым ліку таленавітай спявачкі Анастасіі Трубянковай, часта паведамляем. Піша ў газету адтуль пераважна журналістка-беларуска Людміла Бяляўская. З яе тэкста, што змешчаны ў гэтым нумары, мы і даведаліся: Ніна Кабанава атрымала нядаўна падзяку Пасольства Беларусі ў Расіі, якую ўручыў ёй Пасол Ігар Петрышэнка. Гэта вялікі гонар. Віншуем, Ніна Васілеўна!

Людміла Урванцава: Гран-пры фестывалю і дыплом ад абласной бібліятэкі

У ліку беларускіх суполак, пра дзейнасць якіх мы часта расказваем — і "Бацькаўшчына" з Кургана. Цяпер у рабоце цікавы тэкст пра палкоўніка дзяржбяспекі Паўла Уладзіміравa, які пад час вайны пад псеўданімам "Вихрев" кіраваў разведвальна-дыверсійнай групай у тылe ворага, на Міншчыне. Пасля вайны працаваў ў Мінску, прадаўжаў службу у Кургане. Людміла Урванцава даслала кнігу пра яго з серыі "Зауральцы — "невядомыя" героі Вялікай Айчыннай". А нядаўна суродзічка паведаміла, што ў Кургане прайшоў гала-канцэрт дзявятага гарадскога Фэсту нацыянальных культур "Вянок дружбы". Дарэчы, у горадзе жывуць прадстаўнікі 108 нацыянальнасцяў. А Іран-пры фестывалю ў старэйшай узроставай групе ўдастоены Нацыянальны цэнтр беларусаў Зауралля "Бацькаўшчына". Малайцы, суродзічы! Яшчэ спадарыню Людмілу і яе паплечнікаў ушанавалі дыпломам — за іншую добрую справу. На дыпломе чытаем: "Узнагароджваецца Людміла Рыгораўна Урванцава, старшыня Курганскай абласной грамадскай арганізацыі "Нацыянальны культурны цэнтр беларусаў Зауралля "Бацькаўшчына" і Народны ансамбль беларускай песні "Журавачка" — за актыўны ўдзел у абласным фестывалі сельскіх бібліятэк "Жыві, расійская глыбінка!" Дыплом падпісала дырэктар абласной бібліятэкі імя А. Югава Вольга Філімонава.

Любоў Адаскевіч: медаль ад губернатара

Спадарыня Любоў Адаскевіч — не толькі старшыня грамадскай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Томскай вобласці. Яна і дырэктарка Муніцыпальнай бюджэтнай установы дадатковай адукацыі дзяцей Дом дзяцінства і юнацтва "Факел" з 2001 года. Нядаўна суайчыннiца даслала тэкст пра Дзень беларускай лялькі ў Томску. Зямлячка згадала, што "атрымала нядаўна за добрую працу медаль у сувязі з 70-годдзем Томскай вобласці з рук губернатара". Даслала здымкі. "У 2015-м будзе 15 гадоў маёй дзейнасці ў беларускай дыяспары вобласці, — паведамляе зямлячка. — Гэтыя здымкі — маленькая частка майго жыцця". На пытанне, чаму нашы чытачы мала інфармаваныя пра справы беларусаў Томска, прызналася: бясконцыя справы на асноўнай рабоце закружылі, таму і не піша нікому. "Але цікавых спраў шмат, нешта ўсё робім, і намі вельмі цікавяцца ў Томску".

Паведамляе Л. Адаскевіч і цікавую інфармацыю пра міні-скульптуры — малую кераміку Ігара Лебедзева. Пра ўраджэнца Магілёва мы пісалі ў артыкуле "Творы нараджаюцца ў агні" (18.11.2010). Калі майстра не стала, каштоўную калекцыю часткова ўдалося ўратаваць. Мяркуем, творам земляка знойдзецца месца ў беларускіх музеях. Пакуль жа, па словах Любові Аляксандраўны, "частка твораў жыве ў мяне ў кабінеце на рабоце".

...Усіх актывістаў беларускіх суполак, гэтай восенню ўшанаваных, і не пералічыць. Хочацца ўсім нагадаць вядомы выраз: напісанае — застаецца. У кожнай суполцы ёсць людзі, здольныя ўзяць на сябе ролю летапісцаў. Пішыце! У рэдакцыі з увагай паставяцца да вашых паведамленняў. Такое супрацоўніцтва, мяркую, дасць добры плён.

СУПОЛЬНАСЦЬ

І філасофія, і мастацтва

Кацярына Мядзведская

Чайная цырымонія ў Мінску: усё робіцца па правілах

На сапраўднай японскай чайнай цырымоніі можна было пабываць у Мінску і ў Віцебску

Шанец хоць раз патрапіць на чайную цырымонію выпадае ў жыцці не кожнаму. Нядаўна пабачыць яе ў Мінску, Віцебску змаглі сотні беларусаў: дзякуючы Пасольству Японіі ў Беларусі. Два дні ў Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур у Мінску майстар японскай чайнай школы "Урасэнкэ" Юко Кацура знаёміла гасцей з традыцыямі Усходу. Асістэнты — Сідзуэ Кабаясі і Кіміко Тамідзава, студэнты-японазнаўцы з Белдзяржуніверсітэта. Аднак часта чай па-японску піць не ўдасца: доўга... Як прызналася Юко-сан, і японцы звычайна п'юць "хуценька". Яна патомны майстар: продкі гатавалі напой яшчэ ў XVII стагоддзі. Цяпер жанчына праводзіць цырымоніі ва ўстановах Японіі ды за мяжой.

Госця расказвала пра гісторыю чайнай традыцыі, яе правілы і асаблівасці: гэта ж і філасофія, і мастацтва. "Важная кожная дробязь: якое на вас адзенне, з якімі думкамі рыхтуеце напой", — казала яна. Быў прагляд фільма, потым пачалася цырымонія. Першымі яе гасцямі былі старшыня аб'яднання ўсходняй культуры і традыцыйны "Хагакурэ" Святаслаў Гаеўскі і асістэнтка майстра Кіміко-сан. На сцэне — маленькая печка і прыборы, наводдаль — скрутак з іерогліфамі і кветкай: хрызантэма. Абрад пачаўся з працяглых паклонаў: гаспадыні, чайным прыборам і... чаю, зялёнаму "Маці" ў парашку, з якім і праводзяцца цырымоніі ўжо больш за 800 гадоў.

Вось госці ўсаджваюцца на падлогу. Гаспадыня падае ім салодкія прысмакі: у Японіі ядуць іх, а пасля п'юць чай. Не ў прыкуску... Пакуль госці лагодзяцца, гаспадыня працірае прыборы, насыпае ў кубкі парашок, разводзіць кіпнем, размешвае бамбукавым венчыкам… Усё — па правілах, вельмі марудна, у пэўнай паслядоўнасці. Тое і заварожвае! І вось напой гатовы. Можна спрабаваць.

Цырымонія праводзілася для пасла Японіі ў Беларусі Сігэхіра Мімары і яшчэ чатырох гасцей: выкладчыцы Акадэміі мастацтваў Ірыны Кастылячэнкі, арганізатара фэсту ўсходнеазіяцкай культуры "Хіган" Святланы Шавель, праграмнага дырэктара кінафестывалю "Лістапад" Ігара Сукманава і Аляксея Якаўлева, прадстаўніка чайнай студыі Анастасіі Вялічкі. Частаваліся чаем і іншыя госці цырымоніі. Чай аказаўся прыемным на смак. Майстар казала: вельмі карысна для здароўя.

Яшчэ была такая ж чайная цырымонія ў Віцебску — яна праводзілася майстрам з Японіі ў гарадскім Доме кіно. Дарэчы, у японцаў цырымонія называецца "ітыга іціэ", што азначае: "непаўторная сустрэча".

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

На Залатой Горцы

У мінскага касцёла ў імя Найсвяцейшай Тройцы і святога Роха багатая гісторыя

Галіна Івуць, Адам Мальдзіс

Вежа касцёла відаць з вокан рэдакцыі "Голасу Радзімы": зусім побач такое высокае суседства. Храм — на Залатой Горцы, у двары ля скрыжавання праспекта Незалежнасці з вуліцай Казлова, за Палацам мастацтва. Ягоная гісторыя пачалася з драўлянага храма на іншай, Траецкай гары Менска, узведзенага каралём Ягайлам. Ды летам 1409-га той будынак згарэў. Ад яго ж засталося "адгалінаванне": драўляная капліца на могілках, што былі на Залатой Горцы. У 1796-м капліцу асвяцілі як парафіяльны касцёл. Побач, справа ад уваходу, узвялі і каплічку ў імя святога Роха. Унутры яе знаходзілася цудатворная фігура святога: яна, лічылася, у свой час выратавала Мінск ад варожай навалы. Дарэчы, святы Рох, ці Рох з Манпелье (па французску: Roch) атрымаў вядомасць як абаронца ад чумы. Лічыцца заступнікам некалькіх італьянскіх гарадоў і горада Манпелье ў Францыі, дзе ў гонар яго названы сабор, вуліца, сквер і чыгуначны вакзал.

На мінскіх могілках на Залатой Горцы знайшлі супакой многія знакамітыя гараджане, сярод іх і дзядзька славутага кампазітара з Міншчыны Станіслава Манюшкі — асветнік Дамінік Манюшка. Ён ўвайшоў у гісторыю тым, што адмяніў у сваіх маёнтках прыгоннае права яшчэ на пачатку XIX стагоддзя.

Звернемся, аднак, да гісторыі касцёла. З часам стары будынак струхнеў, і ў 1861-м мінскаму біскупу А. Вайткевічу ўдалося атрымаць ад уладаў дазвол на будаўніцтва новага, мураванага. Узвялі яго за тры гады ў неагатычным стылі па праекце акадэміка Пецярбургскай акадэміі мастацтваў М. Сівіцкага. Святыня будавалася на сродкі, пакінутыя па тастаманце стацкім саветнікам Ігнаціем Лясковічам і яго жонкай Юзэфай, а таксама іншых ахвярадаўцаў. І вось 150 гадоў таму, нягледзячы на складанасці, выкліканыя падаўленнем паўстання 1863-га, 1 лістапада 1864 года касцёл быў асвечаны пад падвойным найменнем: Унебаўзяцця Найсвяцейшай Марыі Панны і святога Роха. Захавалася і ранейшае імя: Найсвяцейшай Тройцы. На вежы над галоўным уваходам размясціліся чатыры званы, а на хорах быў устаноўлены арган "на 18 галасоў". Пры святыні ксяндзом Сенчыкоўскім была створана славутая школа арганістаў. А 16 жніўня, у дзень святога Роха, на Залатой Горцы разам з гараджанамі збіраліся тысячы пілігрымаў.

Такім бачны храм на Залатой Горцы з вокан рэдакцыі

Пададзім і асноўныя вехі гісторыі Залатагорскага касцёла ў мінулым стагоддзі. У атэістычныя 30-я быў ён зачынены. Са святыні вынеслі алтары, абразы, арган, знікла фігура святога Роха. Пасля вайны там размясцілі кнігасховішча Нацыянальнай бібліятэкі. Але пасля рэстаўрацыі ў 83-м будынак быў абвешчаны помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння і прыстасаваны пад Залу камернай музыкі Белдзяржфілармоніі. Праз год у апсідзе, на месцы галоўнага алтара, устанавілі сучасны электрааргән.

З 1991 года ў касцёле аднавіліся набажэнствы. Арган захавалі, для бакавых алтароў скульптар Валерыян Янушкевіч вырабіў металічныя фігуры святога Роха (справа) і Найсвяцейшай Марыі Панны (злева). Майстру належаць рэльефныя выявы прыпынкаў Крыжовага Шляху, мемарыяльны знак каля ўваходнай лесвіцы ў святыню.

Паступова касцёл на Залатой Горцы, дзе асноўныя набажэнствы пачаліся і адбываюцца сёння на беларускай мове, атрымаў вядомасць і ў краіне, і ў свеце, асабліва сярод нашых суайчыннікаў. Адліццё фігуры Найсвяцейшай Марыі Панны, напрыклад, фінансавалі беларусы з Чыкага. З удзелам дыпламатаў, памятаецца, адпраўляліся тут імшы памяці ўраджэнца Мінска, рэдактара папулярнага парыжскага месячніка "Культура" Ежага Гедройца, маці апошняга з князёў Мсціслаўскіх і Заслаўскіх ганаровага прафесара БДУ Анджэя Цеханавецкага. У касцёле іграли нашчадкі Міхала Клеафаса Агінскага — жыхары Англіі браты Залускія. Тут групаваліся цёмнаскурыя жыхары Беларусі, сярод якіх беларускі паэт, музыка і тэлевядучы Андрусь Такінданг (дарэчы, аднойчы ён сфатаграфаваўся як рэкламіст "Голасу Радзімы")… Усяго падобнага не пералічыць.

З 2000 года ў касцёле Найсвяцейшай Тройцы (святога Роха) рэгулярна праводзяцца фестывалі духоўнай музыкі "Залатагорская ліра". Напярэдадні 150-годдзя святыні некалькіх тыдняў праходзіў XI такі фэст з удзелам мінскіх і полацкіх музыкаў і спевакоў. Фінал юбілею прыпаў на 15 лістапада. У Залатагорскім касцёле была ўрачыстасць. Імшу з вялікім казаннем адслужыў Мітрапаліт Мінскі і Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч. Пра гісторыю першай па часе заснавання мінскай каталіцкай святыні гаварылі навукоўцы-парафіяне Алесь Жлутка, Язэп Янушкевіч ды іншыя. І велічна гучаў арган, выраблены ў свой час чэшскімі майстрамі і авалоданы потым беларускімі таленавітымі музыкамі.

Сёлета на адным з юбілейных канцэртаў "Залатагорскай ліры" арганістка Алена Абрамовіч прэзентавала слухачам свой альбом кампазіцый на словы Св. Фаустыны Кавальскай. У той прэзентацыі ўдзельнічаў і вядомы хор "Голас душы" з мінскага касцёла ў імя Святых Сымона і Алены.

ЖЫВАЯ СПАДЧЫНА

Моцныя дубы Якуба Коласа

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Бацьку Наталля Андрэеўна амаль не памятае: і года не было ёй, калі яго забралі назаўсёды. Згадвала ў музеі, што ва ўспамінах Максіма Лужаніна знайшла своеасаблівае "прывітанне" ад бацькі. Лужанін запісаў са слоў Коласа прыкладна такое: маўляў, адзін разумны пісьменнік першым убачыў паралель між кругамі пакут, якія праходзіць Сымон-музыка, і Дантавымі кругамі пекла. Далей Колас дадаў, што "і той недзе згінуў у далёкіх краях". Прушынская лічыць: то згадка пра бацьку, бо ён і Дантэ чытаў, і з Коласам сустракаўся — ёсць факты.

Кожны з нас праходзіць у гэтым свеце, а не толькі недзе там, свае крутi. Экспазіцыя ў Коласавым доме, які 4 лістапада будзе святкаваць 55-гадовы юбілей, сам лёс яго былога гаспадара таму сведчаннем. Ды ўсё ж не страху перад будучыняй, а духоўнай стойкасці, любові да роднага, забыць якое мы не маем ні сілы, ні маральнага права, дзе б ні былі, можна вучыцца ў Коласавым доме. І мы з Наталляй Андрэеўнай ды Аняй падышлі да коласавых дубоў. "А чаму іх чатыры?" — уважліва аглядала волатаў жанчына. Бо гэта ж як сам Бацька з трыма Сынамі: Данілам, Юркам, Міхасём. Была і бяроза, у гонар жонкі Якуба Коласа, ды засохла. А дубы стаяць, хоць няма на гэтым свеце ні гаспадара сядзібы, ні першага дырэктара і стваральніка Коласаўскага музея Данілы Канстанцінавіча — сёлета ягоныя 100-я ўгодкі. І Юрка прапаў без вестак яшчэ на вайне.

Між тым Коласавых дубоў пабольшала! Зінаіда Камароўская расказала, што на наступны дзень пасля Каласавінаў — навуковай канферэнцыі ў гонар Песняра — усе ўдзельнікі, госці па традыцыі паехалі ў філіял музея: у Панямонне. Культурная праграма ладзілася клопатамі Стаўбцоўскага райвыканкама, у ёй удзельнічалі мясцовыя творчыя гурты. Вельмі хораша, хлебам-соллю віталі гасцей. Яны ж наведалі мясціны, звязаныя з Якубам Коласам: Акінчыцы, Ласток, Альбуць, Смольню, Мікалаеўшчыну. "У 2011-м сумесна з Анатолем Грэкавым, старанным рупліўцам на ніве Коласавай спадчыны, у Смольні мы заклалі сквер "Дрэва жыцця", — вядзе аповед Зінаіда Мікалаеўна. — Час хуткаплынны, і ўжо Анатоль Васілевіч памёр… А

Дубы ў гонар Якуба Коласа высаджваюцца ў Смольні

сквер, прысвечаны славутым асобам Бацькаўшчыны, штогод пашыраецца, у ім ужо звыш 50 дрэўцаў. Летась пасадзілі мы дрэўца і як знак памяці пра Анатоля Грэкава. Сёлета падумалі: а дубоў, прысвечаных самому Якубу Коласу, у скверы і няма… Там і дрэва Янкі Купалы ёсць, і Еўфрасінні Полацкай, і Аляксандра Пушкіна. Гэта супрацоўнікі Коласаўскага музея былі ў Міхайлаўскім — і адтуль дрэўца прывезлі ды пасадзілі. Дарэчы, а вы ведаеце: ёсць версія пра беларускія родавыя карані Пушкіна. Кажуць, сам ён, выводзячы прозвішча ад "Григория Пушки, который в XVIII веке пришел из Новугородка", меў на ўвазе не рускі Ноўгарад, а Наваградак — цяпер Навагрудак на Гродзеншчыне".

Дык вось, у гонар Якуба Коласа сёлета пасадзілі ў скверы "Дрэва жыцця" тры дубкі. Устанавілі адпаведныя шыльды. Пачэсную, патрыятычную справу зберагальнікі Коласавай спадчыны маюць намер прадаўжаць. Жадаем ім плёну! І хай Коласавыя дубы заўжды будуць нам напамінам: каб не знікнуць бясследна — трэба моцна трымацца каранямі за родную зямлю. Дарэчы, Зінаіда Камароўская праз нашу газету звяртаецца да суродзічаў з розных краін: прывозьце ў коласаўскую Смольню і свае дрэўцы. Хай растуць на зямлі Бацькаўшчыны ў гонар тых, хто прымнажаў славу беларусаў і ўдалечыні ад яе.

Прасіла З. Камароўская дрэўца з Петразаводска ці з мурманскай Колы, дзе ў другі раз быў арыштаваны пісьменнік, ад родных Андрэя Мрыя — як знак духоўнай повязі і яго самога, і нашчадкаў з Беларуссю. Для якой усе яны — родныя дзеці, хай сабе і без мовы продкаў. То ж не віна іх — бяда...

ВЕСТКІ

Конкурс для таленавітых

Музей Якуба Коласа праводзіць юбілейны конкурс

Гэта конкурс творчых работ "Наш музей адзначае юбілей", якія адлюстроўваюць дзейнасць музея і прысвячаюцца яго 55-годдзю. Палажэнне пра конкурс ёсць на сайце музея. Намінацыі: літаратурны конкурс, фотаконкурс і конкурс выяўленчага мастацтва (малюнак, паштоўка, пано, калаж, вырабы hand-made). Супрацоўнікі музея прадумалі і падтэмы. У прыватнасці, на літконкурс прымаюцца творы ў тэматычных плынях: "Віншую мой музей", "Падарожжа ў свет Коласавых твораў" (музейная казка), "Калі б я быў дырэктарам музея…", "Музей Коласа ў будучыні" і "Мой родны кут, як ты мне мілы…" На фотаконкурс прымаюцца здымкі, зробленыя пад час падарожжаў па Коласавых мясцінах і такой тэматыкі: "Стаіць мая хата між хвой кучаравых…", "Партрэт супрацоўніка музея", "Экспанат пад незвычайным ракурсам".

Як патлумачыла дырэктар музея Зінаіда Камароўская, конкурс разлічаны на дзяцей і падлеткаў. Ён паспрыяе папулярызацыі творчасці Песняра, дапаможа выявіць і заахвоціць юныя таленты і прыцягне ўвагу да Коласаўскага музея.

РОДНАЕ

Падарылі госці казкі

У Рыгу завіталі з Мінска казачніца Алена Масла і паэт Сяргей Панізьнік

У латвійскім таварыстве беларускай культуры "Сьвітанак" паважаюць традыцыі продкаў. Мы ведаем, што на Вялікія восеньскія Дзяды, у адрозненне ад веснавой Радаўніцы, прынята згадваць не толькі спачылых з блізкай радні, а і ўсё палатно нашых повязяў з папярэднікамі. З усімі, хто жыў на зямлі ў розныя часы. Таму "сьвітанкаўцы" запалілі памінальныя свечкі, усклалі кветкі да магіл вядомых латвійскіх беларусаў Сяргея Сахарава і Янкі Кабановіча. І літаратурную сустрэчу, на якую запрасілі сяброў, распачалі з традыцыі, якую шануюць беларусы свету: з малітвы за беларускі народ "Магутны Божа". Гарэлі свечкі ў знак памяці і павагі да продкаў.

Была прэзентацыя энцыклапедычнага даведніка "Сузор'е беларускага памежжа", які выдадзены нядаўна ў Мінску — спадзяемся, пра яго раскажа яшчэ "Голас Радзімы". Кнігу прэзентавалі аўтары шэрагу артыкулаў для яе, даўнія сябры пісьменнік Сяргей Панізьнік і мастак Вячка Целеш. Пададзены там звесткі і пра сяброў "Сьвітанка", Аб'яднання беларусаў-мастакоў "Маю гонар". Згаданы суродзічы з Латвіі, якія рупіліся на беларускай ніве і больш стагоддзя таму, сярод іх і Пятро Масальскі. Перакладаць латышскія народныя казкі на беларускую мову былы выпускнік Люцынскай беларускай гімназіі Пятро Масальскі (літаратурны псеўданім Пятро Сакол) пачаў у 30-я гады. Пяць перакладаў выйшлі ў зборніку "Латышскія народныя казкі" ў 1994-м. А летась у выдавецтве "Мастацкая літаратура" пабачыла свет кніга "Добрыя лекі". Сяргей Панізьнік, укладальнік яе, расказаў, як няпроста працавалася суродзічу: здароўе падводзіла. У наступным годзе — 110-я ўгодкі паэта і фальклярыста. Варта шанаваць імя творцы, народжанага за межамі Беларусі ды ёй адданага.

Прыйшла на свята і нявестка Пятра Масальскага, спадарыня Галіна. Дзялілася ўспамінамі, як дапамагала свёкру ў працы. Галіна Інакенцьеўна замест ганарару, які прызначаўся сям'і паэта, папрасіла ў выдавецтве самі кнігі. Вырашыла падарыць іх Рыжскай Беларускай асноўнай школе імя Янкі Купалы. Гэта, як заўважыла пісьменніца Алена Масла, рэдактар выдання, першая дзіцячая латышская кніга, што выйшла ў Беларусі за апошнія 20 гадоў. Дай Бог не апошняя! Бо выданне такіх кніг надзвычай умацоўвае міжкультурны дыялог.

Калі Сяргей Панізьнік у Рызе — госць нярэдкі, то Алена Масла прыехала да нас упершыню. Хоць Алена піша казкі для дзяцей і падлеткаў, чытаюць яе кнігі і дарослыя. Творы перакладаліся на розныя мовы, яе часам нават называюць беларускай Астрыд Ліндгрэн... У Нацыянальным конкурсе "Мастацтва кнігі" лепшымі выданнямі ў розныя гады названы яе кнігі "Каляды з хроснай", "Першая прыгажуня". Алена Масла ўшанавана прэміяй "Залаты Купідон" (2010) у намінацыі "Дзіцячая літаратура". Вось якая казачніца, ды яшчэ і шчодрая: прывезла кніжкі-падарункі і Школе імя Янкі Купалы, і "Сьвітанку", і Цэнтру дзіцячай літаратуры, што пры Латвійскай нацыянальнай бібліятэцы.

Аматараў казак шмат і ў Школе імя Янкі Купалы. Туды таксама завіталі госці з Мінска. Зрабілі для тых, хто любіць беларускую мову, экскурсію ў свет чароўнага. Алена Масла і Сяргей Панізьнік знаёмілі юных рыжан з цудоўнымі казкамі, якія школьнікі цяпер могуць чытаць і па-беларуску.

Сустрэча з пісьменнікамі на Дзяды ў Рызе стала магчымай дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры Латвіі ды візавай падтрымцы Беларускага інфармацыйнага цэнтра. Таварыства "Сьвітанак" выказвае таксама падзяку за ўдзел у сустрэчы прадстаўнікам Пасольства Беларусі ў Латвіі: саветніку-пасланніку Яраславу Міцкевічу і першаму сакратару Аляксандру Сушкевічу.

Таццяна Касуха, г. Рыга

Казачніца Алена Масла дае аўтограф юнаму рыжаніну

РАЗАМ

Зямля далёкая і блізкая

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Азнакамітую "Лявоніху" выканаў фальклорны гурт "Рождество", якім 20 гадоў кіруе Вольга Гурына. Горача прымалі гледачы і гурт "Спатканне" з Беларусі пад кіраўніцтвам Сяргея Кудзіна. "Народны ансамбль песні і танца "Спатканне" Пятрышкаўскага сельскага дома культуры (Мінскі раён) за любоў і адданасць народнаму мастацтву, за павагу і беражлівае стаўленне да вытокаў народнай творчасці вытрымаў іспыт і па праве атрымаў званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь", — такія звесткі пра таленавітых гасцей-землякоў знайшла я ў інтэрнэце. Песні ж з-пад Мінска гучалі па-беларуску, што нібы ўскалыхнула залу, у якой сабралася нямала сібірскіх беларусаў. І ўвогуле эмоцый было, як кажуць, цераз край, калі на сцэну выйшаў кіраўнік калектыву "Сябры": народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка. Знакамітыя "Белавежская пушча", "Прыязджайце да нас у Беларусь!", "Перажывем!" ды іншыя песні сустракалі авацыямі, зала вітала спевака стоячы.

Не застаўся ў баку ад Дзён Беларусі ў Сібіры і Новасібірскі цэнтр беларускай культуры. Пасля бліскучага выступу гурта "Спатканне" дырэктар Цэнтра Ніна Кабанава наладзіла сустрэчу артыстаў з актывам філіялаў цэнтра, кіраўнікоў самадзейных гуртоў вобласці. У Доме нацыянальных культур імя Генадзя Завалокіна, дзе размяшчаецца НЦБК, госці далі бліскучы майстар-клас. Сельскім майстрам, якім не давялося пабываць на вялікім канцэрце, артысты зрабілі каштоўны падарунак, шчодра паказаўшы, з жартамі-прымаўкамі, амаль увесь рэпертуар. Дзяліліся тонкасцямі майстэрства, гаварылі пра асаблівасці беларускай народнай песні. Адзначылі госці і высокі прафесійны ўзровень салісткі Цэнтра Анастасіі Трубянковай, з якой разам выступалі ў Канцэртнай зале.

Адкрытая, сардэчная сустрэча ўсхалявала і гасцей, і сібіракоў. Потым было і чаяванне, і "чарка на пасашок", і словы падзякі гаспадарам. Беларускім артыстам спадабаўся "шырокі край з адкрытай душой", іх вельмі ўразілі маштабы Новасібірска. Яны дзякавалі "такой далёкай і цяпер такой блізкай зямлі Сібіры, асабліва беларусам, якія нас сардэчна і душэўна прымалі". І цёпла павіншавалі дырэктарку Цэнтра Ніну Кабанаву з уручэннем падзякі Пасольства Беларусі ў Расіі — за вялікі асабісты ўклад у захаванне беларускай культуры, умацаванне дружбы паміж народамі Беларусі і Расіі. Падзяку, дарэчы, уручыў Ніне Васілеўне напярэдадні Пасол Беларусі ў Расіі Ігар Петрышэнка.

Ніна Кабанава і кіраўнік гурта "Спатканне" Сяргей Кудзін

Людміла Бяляўская,
Новасібірскі цэнтр беларускай культуры

ВЕСТКІ

На "Бярозку" гледзячы

Іван Іванаў

Нядаўна стала вядома: з наступнага года знакамітае выданне для школьнікаў будзе выходзіць у новым фармаце

А вы ведаеце, чаму яшчэ і цяпер Беларусь называюць "зямлёй паэтаў"? Можа, таму, што ў іх былі вельмі папулярныя перыядычныя выданні на беларускай мове — газета "Піянер Беларусі" (пазней "Раніца"), часопісы "Бярозка" і "Вясёлка". Рэдакцыі двух першых размяшчаліся за савецкім часам па суседстве, у знакамітым Доме друку, што на Ленінскім праспекце, 77. І тысячы таленавітых беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак прывучаліся цаніць прыгажосць роднага слова, спрабавалі свае сілы ў маляванні ды і нават знаёміліся дзякуючы ў тым ліку і знакамітаму часопісу "Бярозка". Сацыяльных жа сетак раней не было! А вось адрасы юных аўтараў змяшчаліся пад іх творамі.

Мяркуем, навіну пра тое, што "Бярозка" вяртаецца з-пад крыла (і вокладкі) часопіса "Маладосць" — так яны суседзілі тры гады — многія суайчыннікі замежжа ўспрымуць з радасцю. І калі вы жадаеце далучаць сваіх дзяцей, унукаў да сапраўднай беларускай мовы, культуры — паспрабуйце аформіць падпіску на легендарнае выданне. "Не бывае так, каб вартая знаходка папярэднікаў сышла ў нябыт. — упэўнена Святлана Дзянісава, куратар праекта па аднаўленні самастойнасці часопіса "Бярозка", яна ж і галоўны рэдактар літаратурна-мастацкага часопіса "Маладосць". — Ды і бярозка — даволі жывучае дрэва: трывалае, пругкае. Так што "Бярозка" не знікла! І ўжо ідзе падпіска на яе як на самастойнае і самадастатковае выданне". Святлана звярнулася да ўсіх, хто можа згадаць ранейшую "Бярозку" добрым словам ці ўдзячны ёй за свой творчы лёс. Нагадваючы пра падпісныя кошты, індэксы — а яны ёсць і ў беларускіх, і, спадзяемся, у замежных падпісных каталогах, — Святлана просіць дапамагчы "стаць на ногі" адроджанай "Бярозцы". Вядома ж, справа тым хутчэй пойдзе, раскруціцца, чым больш будзе чытачоў-падпісчыкаў.

"Бярозка" будзе мець 48 мелаваных каляровых старонак, сучасны імідж, інтэрактыўны кантэнт. Ды галоўнае ў ёй, слушна лічыць куратар — гэта чытачы. А пакольк і ў нашых школьнікаў не заўсёды яшчэ грошы водзяцца ў кішэнях, то Святлана Дзянісава і звяртаецца да нас, дарослых: "Падтрымайце кволы расток, аформіце падпіску. Для каго? Можна — для ўласных дзяцей, пляменнікаў, унукаў і нават суседзяў ці сяброў — што таксама ж бывае! — школьнага ўзросту. І проста для школ, з якіх вы пайшлі ў жыццё. І проста для незнаёмых дзяцей — каб яны чыталі ды раслі, вобразна кажучы, не на лес гледзячы — а на "Бярозку", узгадаваную клапатлівымі рукамі таленавітых людзей, У тым ліку і юных талентаў, за якімі — наша будучыня. І вось калі новая "Бярозка" набярэ моц і папулярнасць — тады зможаце ганарыцца: то ж і мая заслуга!"

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў

Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

E–mail: golas_radzimy@tut.by

Аб'ём выдання: 1 друк. арк. **Тыраж:** 1930, **Заказ:** 1583

Час падпісання ў друк: 20.10 Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2014